**УДК 342**

# ЭВАЛЮЦЫЯ ПРАДСТАЎНІЧЫХ ІНСТЫТУТАЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

***Л.Д. АНІСЬКОВІЧ***
**(*Прадстаўлена: ст. выкл. А.В. ВАЛЕЎКА)***

*Прадстаўнічыя органы ўлады – дзяржаўныя і муніцыпальныя органы, склад якіх фарміруееца шляхам выбараў у іх прадстаўнікоў ад усяго народа або пэўнай яго часткі. У артыкуле падрабязна разглядаюцца працэсы фарміравання і эвалюцыянавання прадстаўнічых інстытутаў, іх віды, структура, а таксама іх характэрныя асаблівасці ў кантэксце 16–18стст.*

У 1569 г. быў падпісаны акт Люблінскай уніі, згодна з якім павінна было адбыцца зліццё дзвюх дзяржаваў: Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага ў адзіную шматнацыянальную канфедэрацыю пад назвай Рэч Паспалітая. Паводле гэтага акта аб'яднанне дзяржаваў адбывалася згодна сцверджаным у ім умовам, сярод якіх галоўнай была страта Вялікім Княствам Літоўскім сваёй самастойнасці. Але ў адпаведнасці з артыкуламі Статута 1588 года ВКЛ здолела захаваць сваю самастойнасць.

Вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай былі кароль і Сойм. [1, с. 280]

У адпаведнасці з законам краіны на чале выканаўчай улады стаяў кароль, з канца 16 ст. – выбіраемы. Прававое становішча караля рэгулявалася агульнадзяржаўнымі актамі – "Пакта канвента" і "Генрыхаўскімі артыкуламі", а на Беларусі і ў Літве яшчэ і Статутам 1588 г. [2, с. 75] У сваёй дзейнасці кароль быў адказны перад Вальным соймам.

Заканадаўчая ўлада ў краіне належала Вальнаму (агульнаму) сойму. Соймы падраздзяляліся на звычайныя, што склікаліся каралем, і надзвычайныя. [2, с. 72]

Для выбрання новага караля скліканіся тры соймы:

1) канвакцыйны, на якім вызначаліся час і месца выбараў караля, выпрацоўвалі ўмовы дагавора з кандыдатамі на прастол;

2) элекцыйны (выбарчы), на якім праводзіліся выбары і заключалася пагадненне "Пакта канвента";

3) каранацыйны, на якім ажыццяўлялася ўрачыстая каранацыя і кароль прыносіў прысягу захоўваць усе правы і ўмовы пагаднення. [1, с. 281]

Вальны сойм быў двухпалатны і складаўся з Сената і Пасольскай ізбы (палата дэпутатаў). Вышэйшай палатай сойма з'яўляўся Сенат. Сюды ўваходзілі пэўныя вышэйшыя службовыя асобы дзяржаўнага апарату, вярхі каталіцкага духавенства, ваяводы і кашталяны. [2, с. 72 – 73] Ніжэйшай палатай сойма была Пасольская ізба. У яе ўваходзілі прадстаўнікі (паслы-дэпутаты) ад шляхты асобных паветаў ці земляў канфедэратыўнай дзяржавы, а таксама ў невялікай колькасці дэпутаты ад мяшчан найбольш важных ў палітычных і эканамічных адносінах гарадоў. [2, с. 73]

Што датычыцца выканаўча-распарадчай сістэмы, то тут трэба адзначыць адсутнаць адзіных выканаўча-распарадчых органаў Рэчы Паспалітай. Кожная з частак канфедэрацыі, у тым ліку і ВКЛ, мела свой асобны адміністрацыйны і судовы апарат, сваю прававую сістэму. [2, с. 75]

Звярнуўшы ўбок ад палітычнага ладу дзяржавы, звернемся да вытокаў гістарычнага фарміравання прадстаўнічых органаў ВКЛ – соймаў, а таксама павятовых соймікаў. Пытанню аб зараджэнні і развіцці парламенцкіх інстытутаў улады ў Беларусі надавалі ўвагу дарэвалюцыйныя расійскія вучоныя (Матвей Любаўскі, Фёдар Леантовіч, Мікалай Максімейка, Іван Лаппо і інш.). [3, с. 9].

Шматлікія гістарычныя дакументы сведчаць, што з даўніх часоў насельніцтва старажытных беларускіх дзяржаў (Полацкай, Турава-Пінскай, Віцебскай, Смаленскай зямлі і інш.) збіралася для вырашэння важных жыццёвых пытанняў на сходы, якія называліся па-рознаму: «веча», «снем», «сойм». У гістарычных дакументах XIII–XV стст. сустракаюцца і такія назвы грамадскіх сходаў, як «капа», «купа». [3, с. 11].

У перыяд складвання Вялікага княства Літоўскага веча ў Беларусі працягвала дзейнічаць. Вучоныя адзначалі, што агульнадзяржаўны (вальны) сойм ВКЛ узнік са старажытных вечавых сходаў. Водгукі старажытных вечавых парадкаў бачны ў заканадаўстве Вялікага княства Літоўскага, перш за ўсё ў абласных граматах. Аднак да нашага часу дайшлі больш познія, пацвярджальныя граматы (Полацкай зямлі 1511, 1547, 1580, 1634 гг., Віцебскай зямлі 1503, 1509, 1561 гг., Смаленскай зямлі 1505 г., Драгічынскай зямлі 1511, 1547 гг. і інш.), якія мелі сілу і значэнне мясцовых законаў. [3, с. 14]

Першыя вучоныя, якія займаліся вывучэннем гісторыі парламентарызму ВКЛ, па-рознаму ставіліся да прычын і перыяду ўзнікнення агульнадзяржаўнага сойма. Так, М. Любаўскі адзначаў, што вялікакняская дума (паны-рада), якая стала асновай сойма, у XIV ст. яшчэ не ўяўляла сабой дакладна вызначанай арганізацыі. Вучоны сцвярджаў, што канчатковы склад Рады вызначыўся толькі ў сярэдзіне

XV ст. пры вялікім князі Казіміры, калі яна пераўтварылася з асабістай рады князя ў агульнадзяржаўны орган. [3, с. 15]. Такім чынам, становіцца відавочным, у які перыяд па меркаваннях М. Любаўскага ўзнікаюць першыя агульнадзяржауныя соймы: не раней 15 ст.

Такое размяшэнне пачаткаў інстытута сойму Любаўскім выклікала ажыўлённую дыскусію сярод даследчыкаў пытання, з якіх частка прыйшла да зусім іншых, зрэшты надзвычай адрозных, канстатацыяў. Нягледзячы на пэўныя агаворкі, пазіцыю Любаўскага прыняў Фёдар Леантовіч, які, аднак, паставіў пад сумненне дэфініцыю вялікага вальнага сойму (гэта мог быць з'езд толькі паноў-рады), адзначыў багацце парламенцкай тэрміналогіі (вось жа, былі соймы: вялікія вальныя ў шырэйшым і вузейшым складзе, паноў-рады, удзельных князёў, рускіх зямель, абозныя, супольныя для Польшчы і Літвы, судовы, партыкулярныя паасобных удзелаў і земляў, шляхецкія канфедырацыі) і месца ўлады ў функцыянаванні соймаў. [4, с. 12].

Т. Доўнар у сваім артыкуле "Вытокі і гістарычнае развіццё інстытута парламентарызма ў Беларусі" ставіць пад пэўнае сумненне канцэпцыю Ф.Леантовіча. Гэта можна прасачыць паводле ейных слоў пра тое, што "…, пэўныя нарады вялікага князя з мясцовымі князямі заўсёды мелі месца, таксама як і сумесныя нарады з польскімі каралямі, аднак назваць іх у поўным сэнсе соймамі нельга…". Пазіцыя Т.Доўнар адносна перыяду ўзнікнення і фарміравання першых соймаў у ВКЛ па вялікаму рахунку пераплятаецца з пазіцыяй М.Любаўскага – пачатковым этапам фарміравання сапраўднага сойма-парламента з'яўляецца перыяд збірання пашыранага пасяджэння Рады (15 ст.) , а таксама яна называе і прычыны ўзнікнення сойма: "… сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё дзяржавы, працэс саслоўнага падзелу грамадства, а ў сувязі з гэтым — узрослыя патрабаванні сярэдніх і дробных феадалаў аб павелічэнні правоў і ўраўнанні іх з буйнымі феадаламі." З пункту гледжання Т. Доўнар гістарычны працэс фарміравання сойма выглядаў так: сойм у перыяд складвання централізаванай дзяржавы спачатку (перш за ўсё на працягу XV ст.) уяўляе сабой пашыранае пасяджэнне Рады, а потым паступова афармляецца ў агульнадзяржаўны заканадаўчы орган. Гэты працэс завяршаецца, калі асобныя землі падпарадкоўваюцца непасрэдна цэнтральнай уладзе і замест «абласных соймаў» узнікаюць мясцовыя шляхецкія соймікі, на якіх выбіраюцца дэлегаты ад паветаў на агульнадзяржаўны сойм.

Сярод праціўнікаў канцэпцыі Любаўскага, з аднаго боку, маем Мікалая Максімейку, які цалкам адмовіўся прызнаваць ягоную працу, цвердзячы, што пра соймы ў літоўска-рускай дзяржаве можна казаць нашмат раней, бо літоўскія паны ужо ў 13ст. валодалі правам выбару ўладара. Доказам гэтага было пакліканне на трон Віценя пасля, нібыта, забойства Трайдзеня Даўмонтам. Гэтая выбарчая функцыя склала, такім чынам, першае "парламенцкае" права паноўных класаў Літвы, якое на працягу 15ст. было пашырана на дарадчыя і судовыя функцыі. Пэўныя формы парламентарызму (веча) існавалі і ў княствах Русі перад паглынаннем іх Літвою і мелі ўплыў на развіццё гэтай сістэмы ўлады ў супольнай ужо манархіі. У выніку Максімейка лічыў, што менавіта соймы Літвы, дапоўненыя чыноўнікамі, якія ўдзельнічалі ў парламенцкім жыцці рускіх княстваў, склалі гэты самы орган улады ВКЛ у ягоным канчатковым выглядзе, які, аднак, узнік толькі ў 1492 г. [4, с. 12]

Гранічна адрозную ад Максімейкі пазіцыю заняў выдатны даследчык беларускага паходжання прафесар Кіеўскага ўніверсітэта Мітрафан Доўнар-Запольскі. Ён аспрэчыў пэўныя тэзы Любаўскага, але сам напачатку не адкрыў сісттэмы прычынаў развіцця соймаў. Ён лічыў, аднак, што пра нараджанне літоўска-рускага сойму можна думаць толькі тады, калі II Статут Літоўскі 1566 г. вызначыў ягоныя паўнамоцтвы і прызначыў яму месца ў сістэме вышэйшых органаў улады. [4, с. 15].

У перыяд складвання цэнтралізаванай дзяржавы сойм спачатку (перш за ўсё на працягу 15 ст.) ўяўляе сабой пашыранае паседжанне Рады, а потым паступова афармляецца ў агульнадзяржаўны заканадаўчы орган. Гэты працэс завяршаецца, калі асобныя землі падпарадкоўваюцца непасрэдна цэнтральнай уладзе і замест "абласных соймаў" узнікаюць мясцовыя шляхецкія соймікі, на якіх выбіраюцца дэлегаты ад паветаў на агульнадзяржаўны сойм. Гэты парадак быў замацаваны Статутам ВКЛ 1566 г. [3, с. 17].

На стадыі фарміравання агульнадзяржаўны сойм пачынае складацца з трох частак (станаў): вялікага князя, рады і прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Склікаліся ж соймы першапачаткова не для заканадаўчай дзейнасці, а з мэтай вырашэння пытанняў знешняй абароны. [3, с. 17].

У першай палове 16ст.соймы збіраліся даволі часта. М. Любаўскі налічыў у перыяд княжання Жыгімонта Казіміравіча 26 вялікіх соймаў, кіруючыся пры гэтым не простым сведчаннем крыніц аб соймах, а указаннем на тое, што яны датычыліся не толькі радных паноў, але і іншых "станаў". Да такіх соймаў ён адносіў вялікі віленскі сойм 1508–1509 гг., вялікі сойм 1515–1516 гг. У Берасці, віленскі сойм 1521 г. і і нш. [3, с. 19].

На працягу XVI ст. заканадаўча афармляюцца парламенцкія структуры ўлады Вялікага княства Літоўскага. У 40–50-ыя гг. XVI ст. адбыліся змяненні ў сацыяльна-палітычным і эканамічным жыцці дзяржавы, што запатрабавала ўнясення зменаў у заканадаўства. У лістападзе 1551 г. на падставе просьбы паслоў сойма Жыгімонт Аўгуст са згоды паноў-рады стварыў соймавую камісію для перагляду Ста-

тута 1529 г. Перад ёю ставілася задача: тэкст першага Статута «добра обачити и разважити и выразумети то, чого бы потреба была прибавити альбо убавити, альбо отменити» і вынесці на абмеркаванне свае прапановы на наступным сойме. Як бачым, у гэты перыяд змены ў закон маглі ўносіцца ўжо толькі соймам, які становіцца адзіным заканадаўчым органам дзяржавы, а для распрацоўкі праектаў законаў ствараліся спецыяльныя соймавыя камісіі. [3, с. 19–20]. Акрамя выключнага права сойма на ўнясенне зменаў ў закон, ў гэты перыяд да кампетэнцыі сойма адносілася: абмеркаванне кандыдатур і абранне вялікіх князёў, вырашэнне фінансавых і падаткавых пытанняў, міжнародных спраў адносна саюзаў, дагавораў, войнаў з іншымі дзяржавамі, разгляд некаторых судовых спраў, а самае галоўнае – абмеркаванне і прыняцце заканадаўчых актаў. Усё гэта, а таксама перыядычнасць соймавых паседжанняў, соймавы склад і правіла, згодна з якім усе законы дзяржавы павінны прымацца толькі на сойме па згодзе ўсіх станаў, было заканадаўча замацавана Статутам ВКЛ 1566 г. Дадаткова ў 16 ст. упершыню была нарматыўна рэгламентавана магчымасць самастойнай заканадаўчай ініцыятывы вальных соймаў (Віленскі прывілей 1565 г.). Адпаведна гэтаму закону права заканадаўчай ініцыятывы, якое пэўны час належыла вялікаму князю, надавалася сойму.

Статут 1566 г. рэгламентаваў таксама дзейнасць павятовых соймікаў – органаў "шляхецкай дэмакратыі", якія перш за ўсё склікаліся з мэтай абрання дэпутатаў на агульнадзяржаўны сойм. [3, с. 21] Яшчэ большую ўвагу дзейнасці сойма і павятовых соймікаў надаў Статут ВКЛ 1588 г. На паседжанні павятовых соймікаў павінны былі склікацца мясцовыя біскупы, ваяводы, кашталяны і земскія ўраднікі, а таксама князі, паны і шляхта. Закон абавязаў шляхту своечасова з'яўляцца на сойм – да першага дня сесіі. Пачатак працы соймікаў і пытанні для абмеркаванняў на іх вызначаліся ў вялікакняскіх лістах (універсалах). Статут 1588 г. вызначыў таксама іерархію службовых асоб, якія ўдзельнічалі ў працы соймікаў. [3, с. 22].

У сувязі з разглядам тых ці іншых пытанняў у ВКЛ склікаліся розныя па назве мясцовыя соймікі, якія вядуць свае карані са старажытных веча і з'ездаў баяр-шляхты. Перш за ўсё соймікі збіраліся для выбару паслоў на агульнадзяржаўны сойм. Склікаліся таксама элекцыйныя соймікі, якія выбіралі кандыдатаў на пасады суддзяў у новыя шляхецкія суды, а таксама некаторых службовых асоб. З паяўленнем Галоўнага суда (Трыбунала), галоўнай задачай якога стаў разгляд скаргаў (апеляцый) на рашэнні мясцовых судоў, пачалі склікацца штогод трыбунальскія ("грамнічныя") соймікі з мэтай выбару суддзяў Трыбунала. У пачатку 17 ст. пачынае дзейнічаць гаспадарчы соймік, асноўнай задачай якога стала размеркаванне падаткаў, а таксама попісавы з'езд з мэтай попісу войска. [3, с. 24].

Трэба адзначыць, што дзейнасць усіх гэтых соймікаў не была цалкам урэгулявана заканадаўствам. Соймікі з'яўляліся не толькі дзяржаўнымі органамі, але і органамі шляхецкага самакіравання. Шляхта бачыла ў іх прадстаўніцтва і абарону сваіх інтарэсаў у дзяржаве, таму ўвесь час імкнулася пашырыць кампетенцыю соймікаў. Акрамя іх соймікаў, якія па закону павінны былі склікацца манархам, шляхта пачала па ўласнаму жаданню збірацца на на асобныя з'езды (сходы). Упершыню гэта практыка з'явілася ў перыяд бескаралеўя пасля смерці Жыгімонта Аўгуста. Нягледзячы на іх забарону спецыяльнымі соймавымі пастановамі (напрыклад, у 1659 г.), яны працягвалі збірацца, што прыводзіла да яшчэ боль- шага паслаблення цэнтральнай улады. [3, с. 25].

Вучоныя адзначаюць, што паступова ў ВКЛ слабела цэнтральная ўлада, а соймікі эвалюцыянавалі ў бок шляхецкіх з'ездаў, якія не мелі прававых падстаў. Іх роля пастаянна ўзрастала. Адначасова павялічваліся і сродкі ўплыву на соймікавыя пастановы і рашэнні. У 16-18 стст. павятовыя соймікі выбіралі не толькі паслоў на сойм, але і суддзяў, шэраг службовых асоб, давалі згоду на падаткі, кантралявалі распараджэнне рознымі фінансавымі зборамі, клапаціліся аб падтрыманні парадку ў павеце, з дапамогай спецыяльных службовых асоб выконвалі трыбунальскія і іншыя дэкрэты, вызначалі шляхецкае паходжанне, турбаваліся аб пагарэльцах і асобах, якія страцілі маёмасць, займаліся пабудовай і рамонтам судовых будынкаў і інш. У другой палове 18 ст. пачаўся працэс рэфармавання соймікавага ладу. На соймах Рэчы Паспалітай быў прыняты шэраг нарматыўных актаў (закон аб павятовых сойміках, закон аб гарадах і інш.), якія значна ўдасканальвалі парламенцкія структуры дзяржавы. Асаблівае значэнне мела Канстытуцыя 1791 г., якая замацавала палажэнне аб тым, што ўлада, якая «бярэ свой пачатак з волі народа», павінна складацца з заканадаўчай, выканаўчай і судовай галін. Аднак у 1793 г. Канстытуцыя была скасавана, а ў 1795 г. Рэч Паспалітая ўвогуле перастала існаваць. Далейшае гістарычнае развіццё парламентарызму ў Беларусі было звязана з Расійскай імперыяй і расійскімі канстытуцыйнымі рэформамі пачатку XX ст. [3, с. 25–26].

Разгледзеўшы і ацаніўшы ўнутрыпалітычны лад краіны, мы можам разважаць пра тое, што Рэч Паспалітая па форме дзяржаўнага праўлення з'яўляецца не толькі элекцыйнай (выбарнай), але і моцна абмежаванай манархіяй. Практычна ўся ўлада ў дзяржаве належыла Вальнаму сойму і павятовым соймікам, якія складаліся пераважна з паноў-магнатаў і шляхцічаў, таму, хутчэй за ўсё, будзе правільным казаць пра тое, што Рэч Паспалітая па форме праўлення з'яўляецца не манархіяй, а шляхецкай рэспублікай. Калі казаць наконт прадстаўнічых органаў дзяржавы, а іменна адносна пытання аб іх

фарміраванні, мы бачым, што сярод вучоных-даследчыкаў няма адзінага меркавання ў гэтым накірунку. Безумоўна гэта праблема, і праблема цяжкавырашальная, бо нельга афіцыяльна прызнаць адну з канцэпцый адзінай правільнай. Таму, падаецца, што адзіны варыянт для такой сітуацыі – прытрымлівацца таго пункту гледжання, які на ўласны погляд здаецца найбольш правільным. Што датычыцца эвалюцыі прадстаўнічых органаў ВКЛ, мы бачым, што яе этапы не акрэслены строгімі гістарычнымі рамкамі. Але на падставе падрабязнага розгляду развіцця гэтых органаў, мы можам умоўна выдзеліць наступныя этапы: 15ст. (зараджэнне і фарміраванне), 16 ст. (росквіт, узрастанне ролі ў сістэме дзяржаўнага кіравання), 17-18 стст. (перыяд найбольшай актыўнасці).

ЛІТАРАТУРА

1. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбн. дапам. : у 2 ч. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 352 с.
2. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбн. дапам. / А.Ф. Вішнеўскі, І.У. Вішнеўская. – Мінск : Тетра-Сістемс, 2005. – 192 с.
3. Доўнар, Т. Вытокі і гістарычнае развіццё інстытута парламентарызму ў Беларусі / Т. Доўнар // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVI – XVIII стагоддзях : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск – Наваградак, 23–24 ліст. 2007 г. / навук. рэд. С.Ф. Сокал, А.М. Янушкевіч. – Мінск : БІП-С Плюс, 2008. – 374 с.
4. Рахуба, А. Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай 1569 – 1763 гг. / Анжэй Рахуба ; пер. з пол. мовы М. Раманоўскі ; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Медысонт, 2008. – 424 с.